**Выбары*2024. Аналітычная справаздача аб утварэнні ўчастковых камісій**

*Экспертная місія па назіранні за выбарамі*2024[1] арганізаваная Беларускім Хельсінкскім камітэтам і ПЦ "Вясна" ў межах кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары". Місія збірае і аналізуе інфармацыю аб выбарчай кампаніі па адкрытых крыніцах і паведамленнях ад выбаршчыкаў з Беларусі.*

## ВЫСНОВА

1. 25 студзеня 2024 г. скончылася фармаванне ўчастковых выбарчых камісій (УВК), якія з'яўляюцца важным суб'ектам выбарчага працэсу: яны непасрэдна арганізуюць і праводзяць галасаванне і падлік галасоў. Праз адначасовае правядзенне парламенцкіх і мясцовых выбараў*, адзіныя УВК будуць выкарыстоўвацца для абедзвюх кампаній.
2. Агулам было ўтворана 5 411 УВК (на 374 менш, чым на мінулых парламенцкіх выбарах і на 459 менш, чым на мінулых мясцовых выбарах). У іх склад увайшло 57 233 чалавекі. Скарачэнне колькасці УВК ды іх складу разам з падвышэннем нагрузкі (адзіны дзень галасавання для парламенцкіх і мясцовых выбараў*) можа сведчыць аб упэўненасці ў адміністрацыйнай кантраляванасці ўсіх працэсаў, а таксама ў нізкай палітычнай актыўнасці выбаршчыкаў і нізкай яўцы (на фоне адтоку насельніцтва), і аб жаданні ўладаў уключыць у камісіі выключна лаяльных людзей;
3. Утварэнне УВК (як і іншыя этапы выбараў*2024) праходзяць без незалежнага назірання, таму працэдурныя аспекты фармавання УВК застаюцца без грамадскага кантролю. Напрыклад, няма інфармацыі пра спробы азнаёміцца з матэрыяламі вылучэння ў склад УВК (пратаколамі

[1] Для мэтаў дакументаў кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" тэрмін "выбары*" у дачыненні да выбарчай кампаніі–2024 выкарыстоўваецца з зорачкай, каб падкрэсліць умоўны характар гэтага тэрміна, бо любая свабодная і справядлівая выбарчая кампанія прадугледжвае, перш за ўсё, умовы, калі ў поўнай меры рэалізуюцца правы і свабоды, уключна з свабодай слова, свабодай мірных сходаў і асацыяцый, правам удзельнічаць у кіраванні сваёй дзяржавай, свабодай ад дыскрымінацыі, што ў цяперашні час у Беларусі практычна адсутнічае.

сходаў адпаведных структур палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, заяў грамадзян); няма інфармацыі пра тое, як адбываўся працэс абмеркавання і галасавання па прэтэндэнтах у склад УВК.

4. Рэзка абмежаванае кола суб'ектаў, якія вылучалі сваіх прадстаўнікоў у склад УВК (у выніку рэпрэсій катастрафічна скарацілася колькасць грамадскіх аб'яднанняў; пасля перарэгістрацыі з 16 засталіся толькі 4 праўладныя палітычныя партыі);
5. Прадстаўнікі 4 палітычных партый занялі 4 763 (8,3%) месцаў ва УВК. Прадстаўнікі найбуйнейшых праўладных грамадскіх аб'яднанняў, якія маюць з 2023 г. заканадаўча замацаваны асаблівы статус набліжанасці да дзяржавы, занялі 27 880 (48,7%) месцаў;
6. Гэтак жа як і ў выпадку з тэрытарыяльнымі і акруговымі камісіямі, захоўваецца гендарная дыспрапорцыя: доля жанчын (74,7%) у складзе УВК значна перавышае долю мужчын (25,3%).
7. Абноўленае заканадаўства дазваляе не публікаваць пайменныя спісы сябраў УВК, што значна ўскладняе магчымасць ацаніць спецыфіку складу УВК, у прыватнасці тое, наколькі захоўваецца ўжо звыклы "вытворчы прынцып" фармавання выбарчых камісій, калі сябры камісіі прадстаўляюць адзін і той жа працоўны калектыў, а іх непасрэдныя начальнікі з'яўляюцца старшынямі гэтых выбарчых камісій;
8. Практычна поўная адсутнасць інфармацыі пра этап фармавання УВК ды правах і магчымасцях, звязаных з ім, адрасаванай шырокаму колу выбаршчыкаў, паказвае поўную незацікаўленасць уладаў у рэальным удзеле грамадзян у выбарчых працэсах і пацвердзіла курс на абсалютны кантроль уладамі над усімі этапамі выбараў*2024.

## I. ПРАВАВАЯ БАЗА

Участковая выбарчая камісія — орган, адказны за арганізацыю і правядзенне выбараў на пэўным выбарчым участку. Гэта найменшая адзінка ў сістэме выбарчых камісій, якая адказвае за непасрэдную арганізацыю галасавання, рэгістрацыю выбаршчыкаў і падлік галасоў на сваім участку.

УВК утвараецца на перыяд канкрэтнай выбарчай кампаніі ды дзейнічае ў межах паўнамоцтваў, вызначаных у арт. 44 Выбарчага кодэкса (ВК). Паколькі выбары* дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу восьмага склікання і мясцовых Саветаў дэпутатаў дваццаць дзявятага склікання будуць праведзены адначасова, сфармаваныя УВК будуць з'яўляцца агульнымі па выбарах абодвух узроўняў[2].

[2] Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, ч. 1 арт. 34. Утварэнне камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў, па рэферэндуме, па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата

Парадак утварэння УВК ды іх склад вызначаецца арт. 34-35 ВК. Гэтыя нормы сфармуляваныя даволі груваcтка, праз што складаныя для ўспрымання. Тлумачэнне парадку ўтварэння УВК у межах выбараў*2024 даецца ў пастанове Цэнтральнай выбарчай камісіі (ЦВК) ад 21 лістапада 2023 г. № 30 "Аб тлумачэнні парадку ўтварэння выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў у адзіны дзень галасавання 25 лютага 2024 г.".

**Тэрмін фармавання.** УВК павінны быць сфармаваныя не пазней, чым за 30 дзён да пачатку выбараў.[3] У дачыненні да выбараў*2024 – не пазней за 25 студзеня 2024 г.[4]

**Вылучэнне прадстаўнікоў ва УВК.** Парадак вылучэння палітычнымі партыямі, іншымі грамадскімі арганізацыямі, працоўнымі калектывамі ды групамі выбаршчыкаў сваіх прадстаўнікоў ва УВК устаноўленыя арт. 35 ВК.

Вылучыць па адным прадстаўніку ў склад УВК упаўнаважаныя наступныя суб'екты:

- палітычная партыя, іншае грамадскае аб'яднанне;
- працоўныя калектывы арганізацый або калектывы іх структурных падраздзяленняў, што налічваюць не менш за 10 працоўных;
- грамадзяне ў колькасці не менш за 10 чалавек, якія валодаюць выбарчым правам.

Адзін і той жа прадстаўнік можа быць вылучаны ў склад толькі адной тэрытарыяльнай, акруговай, участковай камісіі.

Палітычныя партыі ды іншыя грамадскія арганізацыі могуць з ліку сваіх чальцоў вылучаць прадстаўнікоў у склад УВК у наступным парадку. Кіруючыя органы іх рэгіянальных арганізацыйных структур і першасных арганізацый вылучаюць прадстаўнікоў ва УВК, размешчаныя на адпаведнай тэрыторыі: кіруючы орган Мінскай гарадской арганізацыйнай структуры — у размешчаныя ў Мінску УВК, і гэтак далей. Вылучэнне адбываецца на пасяджэнні кіруючага органа рэгіянальных арганізацыйных структур і першасных арганізацый, пратакол пасяджэння прадастаўляецца ў орган, які ўтварае УВК.

Беларускае заканадаўства захавала савецкі прынцып удзелу працоўных у кіраванні дзяржавай, надаўшы "працоўным калектывам" права з ліку сваіх чальцоў вылучаць прадстаўнікоў у склад УВК альбо ад усяго працоўнага калектыву арганізацыі, альбо паасобку ад працоўных калектываў

[3] Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, ч. 1 арт. 34
[4] Пастанова Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 21 лістапада 2023 г. № 30 "Аб тлумачэнні парадку ўтварэння выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў у адзіны дзень галасавання 25 лютага 2024 г.", п. 1

структурных падраздзяленняў арганізацыі. Прадстаўнікі ад працоўных калектываў вылучаюцца ва УВК адпаведнага раёна, горада абласнога падпарадкавання, раёна ў горадзе. Вылучэнне адбываецца на сходзе працоўнага калектыву, пратакол сходу прадастаўляецца ў орган, які ўтварае УВК. Такі парадак фармавання УВК накіраваны ў першую чаргу на "працоўныя калектывы" ўстаноў ды прадпрыемстваў, якія залежаць ад дзяржавы.

Групы грамадзян, якія валодаюць выбарчым правам, у колькасці не менш за 10 чалавек, могуць вылучаць сваіх прадстаўнікоў у склад УВК на тэрыторыі свайго пражывання шляхам падачы падпісанай імі заявы ў орган, які ўтварае УВК.

Патрабаванні да дакументаў, якія падаюцца ў орган, што ўтварае УВК, для вылучэння сваіх прадстаўнікоў, вызначаныя ў арт. 35 ВК. Прыкладныя формы распрацоўваюцца ЦВК і носяць рэкамендацыйны характар.[5]

**Фармаванне УВК.** Парадак фармавання УВК замацаваны арт. 34 ВК.

Фармаваннем УВК займаюцца раённыя ці гарадскія выканаўчыя камітэты, а ў гарадах з раённым дзяленнем – мясцовыя адміністрацыі. Ускладанне прыняцця рашэння на органы выканаўчай галіны ўлады, падкантрольныя і падсправаздачныя прэзідэнту, перашкаджае прыняццю незалежнага і непрадузятага рашэння.

Рашэнне аб утварэнні УВК прымаецца на пасяджэнні, на якім маюць права прысутнічаць прадстаўнікі суб'ектаў, упаўнаважаных на вылучэнне сваіх прадстаўнікоў у склад УВК. Магчымасць прысутнасці назіральнікаў на такіх пасяджэннях не прадугледжаная.

Асобныя пытанні правядзення пасяджэння тлумачацца пастановай ЦВК ад 21 лістапада 2023 г. № 30. Так, згодна з ёй, на абмеркаванне выносіцца пытанне аб дзелавых і асабістых якасцях асоб, вылучаных у склад выбарчай камісіі. Калі колькасць прэтэндэнтаў перавышае прадугледжаную колькасць сябраў выбарчай камісіі, заслухоўваецца інфармацыя па кожнай кандыдатуры і праводзіцца персанальнае галасаванне. Крытэры адбору ды сістэма ацэнкі кандыдатур не распрацаваная.

У рашэнні аб утварэнні УВК паказваюцца прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) кожнага чальца камісіі, спосаб вылучэння ў склад камісіі, месца знаходжання і нумары тэлефонаў камісіі. Рашэнне аб утварэнні УВК не публікуецца. Замест гэтага не пазней чым праз 7 дзён пасля

[5] Пастанова Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 21 лістапада 2023 г. № 30, ч. 3 п. 10

фармавання камісій у друкаваных сродках масавай інфармацыі публікуецца паведамленне аб факце ўтварэння УВК.

**Склад УВК.** УВК фармуюцца ў складзе ад 5 да 19 чалавек.[6] Таксама рэкамендуецца фармаваць не менш за адну траціну складу УВК (за выключэннем УВК у вайсковых частках і месцах часовага знаходжання выбаршчыкаў) з прадстаўнікоў палітычных партый ды іншых грамадскіх аб'яднанняў.[7] Пры гэтым адсутнічаюць гарантыі забеспячэння роўнасці ўдзельнікаў выбарчай кампаніі за выключэннем абмежавання не больш аднаго прадстаўніка ад адной арганізацыі.

Абмежаванні абавязковага характару вызначаныя для ўваходжання ў склад УВК дзяржаўных служачых. Доля дзяржаўных служачых у складзе асобнай УВК не можа складаць больш за адну траціну.[8] Таксама вызначаныя катэгорыі дзяржаўных служачых, што не могуць уваходзіць у склад УВК: суддзі, пракуроры, кіраўнікі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.[9]

## II. ПРАЦЭС ВЫЛУЧЭННЯ Ў СКЛАД УВК

У адпаведнасці з каляндарным планам, вылучэнне прадстаўнікоў у склад УВК і прадастаўленне адпаведных дакументаў у органы, што іх фармуюць, павінна было адбыцца не пазней за 19 студзеня 2024 г. Звесткі аб прыняцці дакументаў пасля названага тэрміну адсутнічаюць.

Агулам, этап фармавання ўчастковых выбарчых камісій стаў адным з самых непрыкметных для грамадства. Нягледзячы на тое, што ВК дае[10] звычайным грамадзянам магчымасць узяць удзел у дзейнасці УВК, слабое інфармаванне з боку дзяржаўных СМІ (разам з практычна поўнай адсутнасцю незалежных СМІ) і электаральнай адміністрацыі не садзейнічала доступу грамадзян да такой інфармацыі і магчымасці скарыстацца сваім правам. На працягу ўсяго перыяду вылучэння асвятленне гэтага этапу дзяржаўнымі СМІ пераважна зводзілася да канстатацыі факту: *"Не пазней за 25 студзеня будуць сфармаваныя адпаведныя ўчастковыя выбарчыя камісіі"*, — так каментаваў[11] гэты этап старшыня ЦВК. З падобных фармулёвак выбаршчыкам складана зрабіць выснову, што яны таксама могуць узяць удзел у працэсе.

---

[6] Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, ч. 1 арт. 34
[7] Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, ч. 2 арт. 34
[8] Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, ч. 4 арт. 34
[9] Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь, ч. 3 арт. 34
[10] https://elections2024.spring96.org/be/news/114043
[11] https://t.me/belta_telegramm/231696

Інфармаванне выканкамаў абмяжоўвалася фактычна ідэнтычнымі фармулёўкамі:

> *"Прыём дакументаў па вылучэнні прадстаўнікоў у склад участковых выбарчых камісій ажыццяўляецца па 19 студзеня 2024 г. уключна па адрасе: г. Валожын, пл. Свабоды, 2, каб. 321 з 8.30 да 17.30 (абед з 13.00 да 14.00). Выхадныя дні: субота, нядзеля".*

Часта такія паведамленні адсутнічаюць у агульнай стужцы навін на сайтах мясцовых органаў выканаўчай улады, іх неабходна шукаць сярод дакументаў у асобнай укладцы, прысвечанай выбарам*2024. Адзінкавыя сайты выканкамаў утрымлівалі таксама ўзоры дакументаў, якія неабходна запоўніць і падаць у камісію для вылучэння. Ні на адным са згаданых рэсурсаў не публікаваліся падрабязныя памяткі, што раскрываюць правы грамадзян ды спосаб іх рэалізацыі, уключна з пералікам неабходных дакументаў, тэрмінамі падачы ды іншымі важнымі дэталямі. Такім чынам, людзі, якія не валодаюць лічбавай пісьменнасцю, нароўні з тымі, хто не карыстаецца інтэрнэтам, не адсочвае змены на непапулярных у грамадства сайтах выканаўчых камітэтаў, былі фактычна адрэзаныя ад інфармацыі, звязанай з магчымасцю вылучэння ва УВК.

Электаральная асвета застаецца кропкавай, нацэленай на выбраныя групы грамадзян — сябраў праўладных прафсаюзаў ды іншых грамадскіх аб'яднанняў. Так, праўладны Моладзевы парламент Магілёўскага раёна правёў[12] "дзелавую гульню-рэпетыцыю працы выбарчага ўчастка" для "будучых сябраў УВК" яшчэ да фармавання камісій (пасяджэнне Магілёўскага райвыканкама, на якім павінны быць сфармаваныя камісіі, было прызначана на 24 студзеня;[13] сюжэт аб правядзенні "гульні" на дзяржаўным канале з'явіўся пяццю днямі раней).[14]

Яшчэ больш праблемным аказалася інфармаванне аб правядзенні пасяджэнняў мясцовых органаў улады, на якіх павінны быць сфармаваныя УВК. Нягледзячы на тое, што заканадаўства дае палітычным партыям, працоўным калектывам ды грамадзянам, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісій, права прысутнічаць на такіх пасяджэннях, рэалізаваць гэта права ў асобных выпадках было немагчыма з прычыны адсутнасці інфармацыі пра дату і час правядзення пасяджэння (гл., сярод іншых, прыклады Маладзечанскага,[15] Вілейскага[16] раённых выканкамаў).

---

[12] https://elections2024.spring96.org/be/news/113721
[13] https://mogilev.mogilev-region.by/ru/Vybory_2024/
[14] https://www.youtube.com/watch?v=4UU1US4Vyqc
[15] https://www.molodechno.gov.by/edinyj-den-golosovaniya
[16] https://vileyka.gov.by/novosti-respubliki/item/59109-edinyj-den-golosovaniya-25-fevralya-2024-g

Падобнае асвятленне этапу вылучэння прадстаўнікоў ва УВК стварае атмасферу перадвызначанасці іх складаў, дадаткова зніжае давер грамадства да электаральнай кампаніі і заахвочвае адсутнасць незалежнай ініцыятывы выбаршчыкаў.

Інфармацыя пра факты адмовы прыняць дакументы па вылучэнні прэтэндэнтаў ва УВК адсутнічае; у гэтых адносінах важна яшчэ раз падкрэсліць зачышчанае палітычнае поле (у якім адсутнічаюць партыі з павесткай, альтэрнатыўнай праўладнай),[17] адсутнасць рэальнай магчымасці ўдзелу ў выбарах*2024 для незалежных грамадскіх аб'яднанняў і агульную сітуацыю бесперапынных рэпрэсій, што дадаткова ўціскае любую незалежную ініцыятыву. Этап вылучэння прадстаўнікоў ва УВК таксама суправаджаўся новымі актамі запалохвання людзей, якія праяўлялі актыўнасць (у тым ліку ў якасці назіральнікаў) на папярэдніх выбарах.

## III. ПАСЯДЖЭННІ ОРГАНАЎ, ЯКІЯ ЎТВАРАЮЦЬ КАМІСІІ

У адпаведнасці з Каляндарным планам,[18] пасяджэнні раённых, гарадскіх (гарадоў абласнога падпарадкавання) выканаўчых камітэтаў, мясцовых адміністрацый адбыліся ва ўстаноўлены тэрмін, не пазней за 25 студзеня 2024 г.

Як і з інфармаваннем аб вылучэнні, інфармацыя аб месцы ды часе правядзення пасяджэнняў органаў, што ўтвараюць камісіі, рэдка публікавалася.

Так, на сайце Лагойскага раённага выканаўчага камітэта[19] не было абвестак, калі і дзе адбылося пасяджэнне па ўтварэнні УВК. На пасяджэнні Вілейскага раённага выканаўчага камітэта[20] утвораныя 32 участковыя выбарчыя камісіі, але калі адбылося пасяджэнне — не паведамляецца.[21] Смалявіцкі раённы выканаўчы камітэт паведаміў,[22] што пасяджэнне па пытанні "аб утварэнні ўчастковых выбарчых камісій" адбылося 23 студзеня 2024 г., гэта значыць пасля яго правядзення.

Аднак, некаторыя выканкамы інфармавалі аб пасяджэннях да іх правядзення. Так, 19 студзеня 2024 г., Маларыцкі раённы выканаўчы камітэт

[17] https://elections2024.spring96.org/be/news/113485
[18] Каляндарны план арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў дэпутатаў у адзіны дзень галасавання 25 лютага 2024 г., зацверджаны пастановай ЦВК 21.11.2023 г. № 29: https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/calend-edg.pdf
[19] http://logoysk.gov.by/edinyj-den-golosovaniya
[20] https://vileyka.gov.by/novosti-respubliki/item/59109-edinyj-den-golosovaniya-25-fevralya-2024-g
[21] https://vileyka.gov.by/images/banners/TOOLBAR/25-01-2024-03.pdf
[22] https://smolevichi.gov.by/images/doc/049-18401840.pdf

апавясціў[23] пра дату, час і месца правядзення пасяджэння па пытанні ўтварэння ўчастковых выбарчых камісій. На сайце Бабруйскага раённага выканаўчага камітэта таксама размешчана паведамленне[24] пра час і месца правядзення пасяджэння.

## IV. СКЛАД УВК

На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь агулам утворана 5 411 УВК (на 374 менш, чым на мінулых парламенцкіх выбарах[25] і на 459 менш, чым на мінулых мясцовых выбарах).[26] У іх склад увайшлі 57 233 чалавекі[27] (на 6 413 менш, чым на мінулых парламенцкіх выбарах і на 6 583 менш, чым на мінулых мясцовых выбарах). Скарачэнне колькасці ўчасткаў ды задзейнічаных у арганізацыі галасавання сябраў камісій можа сведчыць пра ўпэўненасць уладаў у адміністрацыйным кантролі на ўсіх этапах, а таксама ў жаданні сфармаваць участковыя камісіі выключна з лаяльных да ўладаў людзей. Таксама, гэта можа быць звязана з тым, што ўлады не разлічваюць на высокую цікавасць да выбараў* і вялікай колькасці людзей, якія наведваюць участкі (высокую яўку), на фоне скарачэння насельніцтва ды яго нізкай публічнай палітычнай актыўнасці. Дадаткова, такія скарачэння дазваляюць зэканоміць бюджэтныя сродкі. Акрамя таго, паменшаныя калектывы звышлаяльных сябраў УВК могуць забяспечыць бесперашкодныя парушэнні падчас правядзення галасавання і падліку галасоў, іх утойванне. Скарачэнне колькасці ўчасткаў таксама можа прывесці да больш стараннага кантролю з боку ўладаў над волевыяўленнем грамадзян на маючых адбыцца выбарах*.

---

[23] http://malorita.brest-region.gov.by/ru/vybory-ru/view/soobschenie-o-vremeni-i-meste-provedenija-zasedanija-maloritskogo-rajonnogo-isponitelnogo-komiteta-po-2000002677
[24] https://bobruisk-rik.gov.by/index.php/vyb24/item/28269-сообщение-о-времени-и-месте-проведения-заседания-районного-исполнительного-комитета-по-вопросу-образования-участковых-избирательных-комиссий
[25] Аналітычная справаздача па выніках назірання за фармаваннем участковых выбарчых камісій: https://spring96.org/be/news/97866
[26] Справаздача па выніках назірання за фарміраваннем участковых выбарчых камісій: https://elections2018.spring96.org/be/news/88744
[27] Звесткі аб складзе ўчастковых выбарчых камісій: https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/stat29.pdf

## КОЛЬКАСЦЬ УВК ДЫ ІХ СКЛАД




Прадстаўнікі праўладных палітычных партый занялі 4 763 (8,3%) месцаў ва УВК. Прадстаўнікі астатніх праўладных грамадскіх аб'яднанняў занялі 27 880 (48,7%) месцаў. Па-ранейшаму, асноўнымі, задзейнічанымі ў працэсе фарміравання складаў камісій, з'яўляюцца найбуйнейшыя — *Беларуская партыя "Белая Русь" (зарэгістраваная 02.09.2023), Камуністычная партыя Беларусі, Ліберальна-дэмакратычная партыя Беларусі, Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці, "Белая русь", "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі", "Беларускі саюз жанчын", "Беларускі фонд міру", "Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў" і прафсаюзы, што ўваходзяць у Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі*. Усе гэтыя пяць грамадскіх аб'яднанняў (акрамя Фонду міру) у адпаведнасці з новым законам "Аб асновах грамадзянскай супольнасці" аднесеныя рашэннем Міністэрства юстыцыі[28] да суб'ектаў грамадзянскай супольнасці, "што маюць права на ўзаемадзеянне з дзяржаўнымі органамі (арганізацыямі) у асаблівых формах", г.зн. іх залежнасць ад дзяржавы замацаваная заканадаўча.

[28] https://minjust.gov.by/directions/compare_coverage/




Апазіцыйныя і незалежныя структуры ва УВК не прадстаўленыя. Дыскрымінацыйны падыход да апазіцыйных партый і арганізацый быў прадстаўлены і на мінулых выбарах. Напрыклад, у 2018 г. у склад УВК было ўключана 26 чалавек (11% ад вылучаных або 0,04% ад агульнага складу УВК) ад апазіцыйных партый, а з 83 прэтэндэнтаў ад АГП, адзінай партыі, што была прадстаўлена ў парламенце, у склад камісій увайшоў толькі 1 чалавек.

Абноўленае заканадаўства дазваляе не публікаваць пайменныя спісы членаў УВК, што значна ўскладняе магчымасць ацаніць спецыфіку складу УВК, у прыватнасці тое, наколькі захоўваецца ўжо звыклы "вытворчы прынцып" фармавання выбарчых камісій, калі члены камісіі прадстаўляюць адзін і той жа працоўны калектыў, а іх непасрэдныя начальнікі з'яўляюцца старшынямі гэтых выбарчых камісій

ЦВК прадставіў абагульненую інфармацыю аб складзе УВК,[29] згодна з якой грамадзяне ва ўзросце да 31 года склалі ўсяго 6,5%. З яе таксама вынікае, што пераважная большасць месцаў ва УВК занята жанчынамі: 74,7% ад агульнага складу. Такая ж тэндэнцыя да гендарнага дысбалансу назіраецца і на ўзроўні тэрытарыяльных і акруговых камісій, дзе доля жанчын прыпадае

[29] https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/stat29.pdf

на 81,7% ад агульнага складу. Пры гэтым прыкметная дынаміка павелічэння колькасці жанчын па меры зніжэння адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўзроўню камісіі.

